# Залік як канцэрт

## Чаму студэнты не таньчаць беларускае танга

**Па запрашэнні этнахарэографа і педагога Міколы Козенкі атрымалася трапіць на залік па побытавых танцах у студэнтаў трэцяга курса кафедры народна-песеннай творчасці Універсітэта культуры і мастацтваў. Падчас канцэрта-справаздачы прадэманстравалі праграму апошняга семестра. Убачанае справакавала развагі, якімі дзялюся з чытачамі "К", спадзеючыся на зваротную сувязь.**

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Студэнты паказалі высокі ўзровень харэаграфічнага майстэрства, нягледзячы на тое, што вывучалі побытавы танец усяго 4 месяцы. Праўда, народна-сцэнічны танец ім выкладаюць з першага курса, таму нельга сказаць, што гэтыя маладыя людзі ніколі не таньчылі, а за семестр навучыліся, як гэта адбываецца са студэнтамі кафедры этналогіі і фальклору ўніверсітэта, якой кіруе Вячаслаў Калацэй. Хоць дысцыпліна і завецца "Побытавы танец", элементы сцэнічнасці адчуваліся, усё ж сцэна — родная стыхія гэтых студэнтаў. Таньчылі зладжана, яшчэ больш зладжана прыпявалі (а як па-іншаму, калі гэта студэнты кафедры народна-песеннай творчасці?), пасміхаліся публіцы (праўда, і партнёрам таксама), але адчуванне засталося дваістым.

Ухваляючы вучаніц (а сярод тых, хто здавалі залік — толькі адзін хлопец), Мікола Козенка выказаў думку, што каб яны наведвалі тэматычныя танцавальныя вечарыны, то былі б там самымі папулярнымі дамамі. Але калі танец асацыюецца ў гэтых студэнтак са сферамі вучобы ды, у будучыні, працы, ці захочуць яны таньчыць яшчэ і ў вольны час? І ці будзе прафесійнай танцорцы цікава на такой імпрэзе? Ды і на вечарынах сцэнічныя выкрутасы з падгукваннямі не вітаюцца. Вось для хлопца — так, уменне прафесійна "весці" партнёрку будзе неаспрэчным плюсам і на сцэне, і на нефармальнай вечарыне. Такі вось атрымліваецца гендарны дысбаланс. Хачу заўважыць, што знаёмыя хлопцы, якія даўней маглі быць зусім "ніякімі" танцорамі, пасля заняткаў Міколы Козенкі з "ніякіх" становяцца танцорамі добрымі. Дык што ўжо казаць пра студэнтаў — будучых прафесіяналаў! Арыентацыя на сцэнічнасць, дарэчы, — гэта рыса не толькі ўніверсітэцкай адукацыі. Танцавальныя школы па самых розных кірунках (лацінаамерыканскія танцы, ірландскія, бальныя) выразна падзяляюцца на тыя, што рыхтуюць танцораў на конкурсы, і на тыя, што вучаць таньчыць "для душы". Такі падыход дзейнічае і на пляцоўцы ля Ратушы, дзе зладзяць фестываль нацыянальнай культуры. Некаторыя нават сцвярджаюць, што танга — гэта фінскі нацыянальны гімн. Музыка адаптавалася да мясцовага нацыянальнага характару, стала падобнай да маршавай, больш мяккай, а рухі — больш цнатлівымі. Мікола Козенка распавядае, што запісваў некалькі варыянтаў выканання танга ад беларускіх бабуль, і ўспаміны аб гэтым танцы ў іх былі досыць яркімі.

Цяпер, калі назапашана дастаткова шмат інфармацыі пра малюнкі розных танцаў, музыку, самы час пацікавіцца эмацыйным складнікам, распытаць



Падчас заліку па побытавых танцах. / Фота аўтара

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ